В. М. Саўчанка

# БЕЛАРУСКАЯ МОВА

## МАРФЕМІКА. СЛОВАЎТВАРЭННЕ. МАРФАЛОГІЯ

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Магілёў
МДУ імя А. А. Куляшова
2014

*Электронны аналаг друкаванага выдання:*

Саўчанка В. М.
Беларуская мова : марфеміка : словаўтварэнне : марфалогія
Магілёў : МДУ імя А. А. Куляшова, 2013. – 84 с.

Зборнік падрыхтаваны ў адпаведнасці з тыпавой праграмай па сучаснай беларускай літаратурнай мове, змяшчае тэсты па марфеміцы, словаўтварэнні, марфалогіі і мае на мэце дапамагчы выкладчыку і студэнту вызначыць ступень засваення кожнай тэмы.

Рэкамендаваны для студэнтаў педагагічнага і філалагічнага факультэтаў. Можа быць выкарыстаны настаўнікамі і вучнямі пры падрыхтоўцы да цэнтралізаванага тэсціравання.

**УДК 811.161.3(076.1)**
**ББК 81.2Беи–В6**

Саўчанка, В. М. Беларуская мова : марфеміка : словаўтварэнне : марфалогія [Электронны рэсурс] : зборнік тэстаў для тэматычнага кантролю / В. М. Саўчанка. – Электрон. даныя. – Магілёў : МДУ імя А. А. Куляшова, 2014. – Загал. з экрана.

212022, г. Магілёў
вул. Касманаўтаў, 1
тэл.: 8-0222-28-31-51
e-mail: alexpzn@mail.ru
http://www.msu.mogilev.by

© Саўчанка В. М., 2013
© МДУ імя А. А. Куляшова, 2013
© МДУ імя А. А. Куляшова,
электронны аналаг, 2014

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

# МАРФЕМІКА. СЛОВАЎТВАРЭННЕ

## МАРФЕМНАЯ БУДОВА СЛОВА

### Варыянт 1

***1. Адзначце словы, у якіх ёсць канчатак:***
1) паліто;
2) ЦУМ;
3) вы;
4) смела;
5) разгуляўся.

***2. Адзначце словы з вытворнай асновай:***
1) сям'я;
2) знаёмы;
3) сяўба;
4) галлё;
5) многа.

***3. Адзначце словы з невытворнай асновай:***
1) адзіны;
2) суддзя;
3) вайна;
4) вадаспад;
5) дакладны.

***4. Адзначце словы са звязаным коранем:***
1) любіць;
2) непрыкметны;
3) усмешка;
4) сугучнасць;
5) адлегласць.

***5. Адзначце словы з формаўтваральнымі афіксамі:***
1) крычыце;
2) студзеньскі;
3) адрэзаўшы;
4) вясёлка;
5) найзванчэйшы.

***6. Адзначце словы, правільна падзеленыя на марфемы:***
1) куп-л-ен-ы;
2) па-прас-і-ц-ца;
3) пера-раз-мерк-ав-ан-ы;

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

4) на-запаш-ва-нн-е;
5) абяз-дол-ен-ы.

***7. Адзначце словы аднолькавай марфемнай структуры:***
1) перакладваць, перакладаць;
2) сям'я, куп'ё;
3) дакладчык, дарадчык;
4) асілак, прыцемак;
5) боязь, завязь.

***8. Адзначце аднакаранёвыя словы:***
1) грыб, грыбны, грыбніца;
2) пераклад, перакладчык, перакладаць;
3) уздымаць, здымак, задымлены;
4) свежы, свежага, свежым;
5) сведка, сведчыць, ведаць.

***9. Адзначце формы аднаго і таго ж слова:***
1) перачытваюць;
2) прачытай;
3) дачытаны;
4) прачытаюць;
5) прачытаўшы.

***10. Выпішыце са сказа слова (словы), якое (якія) мае (маюць) нулявы канчатак.***

Даўно ўжо стала неабвержанай ісцінай выснова, што народ, які не ведае мінуўшчыны, не варты і будучыні.

## МАРФЕМНАЯ БУДОВА СЛОВА

### Варыянт 2

***1. Адзначце словы, у якіх ёсць канчатак:***
1) добрасумленна;
2) таксі;
3) райана;
4) адмовіўся;
5) паўтары.

***2. Адзначце словы з вытворнай асновай:***
1) прыступкі;
2) куп'ё;
3) восень;



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

4) сумежны;
5) крыўда.

***3. Адзначце словы са свабодным коранем:***
1) гарачыня;
2) пачынаць;
3) плакаць;
4) вытрымка;
5) адкажуць.

***4. Адзначце словы са звязаным коранем:***
1) разводдзе;
2) шчымлівы;
3) узмор'е;
4) нялёгка;
5) асуджаны.

***5. Адзначце словы з формаўтваральнымі афіксамі:***
1) загучала;
2) напамін;
3) спалохаўшыся;
4) абагрэты;
5) дзяцінства.

***6. Адзначце словы, якія маюць словаўтваральныя афіксы:***
1) просьба;
2) бегучы;
3) чакаць;
4) даўжэйшы;
5) гучны.

***7. Адзначце словы, няправільна падзеленыя на марфемы:***
1) ст-а-год-дз-е;
2) чыт-а-нн-е;
3) вы-купл-ен-ы;
4) вераб[й-і]н-ы;
5) па-шкод-ж-а-н-ы.

***8. Адзначце словы, правільна падзеленыя на марфемы:***
1) вы-раб-л-ен-ы;
2) мядзведж-ы;
3) з-мір-ы-ўшы-ся;
4) салаў[й-і]н-ы;
5) праш-энн-е.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

***9. Адзначце слова (словы), у якіх ёсць дзве прыстаўкі:***
1) абяссіліць;
2) недабор;
3) абагнаць;
4) недавер;
5) недачуць.

***10. Выпішыце са сказа слова (словы), якое (якія) не мае (не маюць) канчатка.***

Нялёгка дастаецца хлеб, што родзіць для нас зямля-карміцелька (Т. Хадкевіч).

## СЛОВАЎТВАРЭННЕ

### Варыянт 1

***1. Адзначце словы, утвораныя прыставачным спосабам:***
1) нехта;
2) бязрадасны;
3) убок;
4) падтэкст;
5) выкрык.

***2. Адзначце словы, утвораныя суфіксальным спосабам:***
1) суддзя;
2) прывычка;
3) абараназдольнасць;
4) мядзведжы;
5) пер'е.

***3. Адзначце словы, утвораныя прыставачна-суфіксальным спосабам:***
1) наваколле;
2) узмужнець;
3) расхрабрыцца;
4) абнадзеіць;
5) звыштрапны.

***4. Адзначце словы, утвораныя бяссуфіксным спосабам:***
1) глуш;
2) абое;
3) вярблюджы;
4) нясмелы;
5) дзевятнаццаты.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

***5. Адзначце словы, утвораныя складана-суфіксальным спосабам:***
1) абараназдольны;
2) шырокамаштабны;
3) сямібор'е;
4) абыякавы;
5) доўгабароды.

***6. Адзначце словы, утвораныя спосабам асновасловаскладання:***
1) дабратворна;
2) дзесяцігоддзе;
3) мёданарыхтоўка;
4) торфабрыкет;
5) цемнаскуры.

***7. Адзначце слова, ад якога ўтвораны назоўнік абагравальнік:***
1) абагрэць;
2) абагравацць;
3) абагравальны;
4) абаграванне;
5) грэць.

***8. Устанавіце адпаведнасць паміж словам і спосабам яго ўтварэння.***

| | |
|---|---|
| А : бег | 1) невытворнае слова; |
| Б : сям'я | 2) прыставачна-постфіксальны; |
| В: асмеліцца | 3) бяссуфіксны; |
| Г : Бабруйскі | 4) суфіксальны. |
| | 5) прыставачна-суфіксальна-постфіксальны; |
| | 6) прыставачна-суфіксальны; |
| | 7) прыставачны. |

***9. Адзначце рады, дзе правільна паказаны словаўтваральны аналіз:***
1) дазвол ← дазволіць (нульсуфіксальны спосаб);
2) накрыча(ць) крык (прыставачна-суфіксальны спосаб);
3) мнагаслоўе многа слоў (зрашчэнне);
4) зернявоз вазіць зерне (асновасловаскладанне);
5) глыбакаводны глыбокая вада (складана-суфіксальны спосаб).

***10. Адзначце сказы са словамі, утворанымі шляхам пераходу з адной часціны мовы ў другую.***

1) Цэлы дзень ідзе дождж.

2) Насустрач дзьмуў марозлівы вецер.

3) У адным сяле ( не важна – дзе) хадзіў баран у чарадзе (К. Крапіва).

4) Усё сваё жыццё чорны дзяцел праводзіць на ствалах дрэў і ў дупле (В. Вольскі).

5) Спыніліся непадалёку ад возера.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

# СЛОВАЎТВАРЭННЕ

## Варыянт 2

***1. Адзначце слова (словы), утвораныя прыставачным спосабам:***
1) пералёт;
2) міжзорны;
3) нечуваны;
4) непрыкметны;
5) бяскрыўдны.

***2. Адзначце словы, утвораныя суфіксальным спосабам:***
1) безбілетны;
2) вуліца;
3) крыўдлівы;
4) дзесьці;
5) кажух.

***3. Адзначце словы, утвораныя прыставачна-суфіксальным спосабам:***
1) бяздушны;
2) узважыць;
3) узмацніць;
4) бязвоблачны;
5) узмор'е.

***4. Адзначце словы, утвораныя бяссуфіксным спосабам:***
1) наледзь;
2) заплыў (назоўнік);
3) смелы;
4) бязмежжа;
5) змагар.

***5. Адзначце слова (словы), утворанае (утвораныя) складана-суфіксальным спосабам:***
1) дабрадушнасць;
2) малапрадуктыўны;
3) меднарудны;
4) аблвыканкам;
5) цемнагрывы.

***6. Адзначце словы, утвораныя складана-нульсуфіксальным спосабам:***
1) дзесяцігоддзе;
2) ледарэз;
3) лёдадрабілка;
4) Сярэднявечча;
5) лесастэп.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

***7. Адзначце слова, ад якога ўтвораны назоўнік халадзільнік:***
1) холад;
2) халадзіць;
3) халадзільны;
4) халодны;
5) ахалоджваць.

***8. Устанавіце адпаведнасць паміж словам і спосабам яго ўтварэння.***

| | |
|---|---|
| А : набегацца | 1) невытворнае слова; |
| Б : сузор'е | 2) прыставачна-постфіксальны; |
| В: бесклапотны | 3) бяссуфіксны; |
| Г : адрозніць | 4) суфіксальны. |
| | 5) прыставачна-суфіксальна-постфіксальны; |
| | 6) прыставачна-суфіксальны; |
| | 7) прыставачны. |

***9. Адзначце рады, дзе правільна паказаны словаўтваральны аналіз:***
1) здароў(е) здаровы (нульсуфіксальны спосаб);
2) медазбор збіраць мёд (асновасловаскладанне);
3) пылаўлоўнік улоўліваць пыл (складана-суфіксальны спосаб);
4) дазваніцца званіць (прыставачна-постфіксальны спосаб);
5) даўгакрылы доўгія крылы (складана-нульсуфіксальны спосаб).

***10. Адзначце сказы са словамі, утворанымі шляхам пераходу з адной часціны мовы ў другую.***
1) Насустрач мне праходзяць людзі.
2) Трэба тэрмінова зайсці ў настаўніцкую.
3) Маці ішла непадалёку.
4) Дзве дзяўчынкі падышлі да сваёй настаўніцы.
5) Проста страшна стала падарожніку: у непагадзі ён зусім адзін.

# МАРФАЛОГІЯ

## НАЗОЎНІК: ЛЕКСІКА-ГРАМАТЫЧНЫЯ РАЗРАДЫ

### Варыянт 1

***1. Адзначце словазлучэнні, у якіх падкрэсленыя словы з'яўляюцца назоўнікамі:***
1) купіць марожанае;
2) спытаць у дзяжурнага;

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

3) атрымаў дзясятку;
4) дзяжурны вучань;
5) памножыць на нуль.

***2. Адзначце агульныя назоўнікі:***
1) студэнты;
2) гарлахвацкія;
3) Смалявічы;
4) донжуан;
5) Нарач.

***3. Адзначце ўласныя назоўнікі:***
1) (М, м)агілёўшчына;
2) (С, с)вята;
3) (В, в)ялікдзень;
4) (П, п)рэзідэнт (канцэрна);
5) (Р, р)экс.

***4. Адзначце канкрэтныя назоўнікі:***
1) страляніна;
2) адчай;
3) тэкст;
4) просьба;
5) рэцэнзія.

***5. Адзначце абстрактныя назоўнікі:***
1) карысць;
2) адукацыя;
3) перагаворы;
4) адпаведнасць;
5) дрожджы.

***6. Адзначце адушаўлёныя назоўнікі:***
1) марыянетка;
2) кітайка;
3) салдат;
4) эльф;
5) ферзь.

***7. Адзначце неадушаўлёныя назоўнікі:***
1) робат;
2) шпроты;
3) туз;
4) гном;
5) карэйка.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

***8. Адзначце зборныя назоўнікі:***
1) волава;
2) дзетвара;
3) гараджане;
4) лісце;
5) калектыў.
***9. Адзначце рэчыўныя назоўнікі:***
1) апілкі;
2) лімон;
3) хлеб;
4) звяр'ё;
5) салома.
***10. Адзначце адзінкавыя назоўнікі:***
1) радасць;
2) жэле;
3) сняжынкі;
4) гарошына;
5) студэнцтва.

## НАЗОЎНІК: ЛЕКСІКА-ГРАМАТЫЧНЫЯ РАЗРАДЫ

### Варыянт 2

***1. Адзначце словазлучэнні, у якіх падкрэсленыя словы з'яўляюцца назоўнікамі:***
1) узяць сталовую лыжку;
2) пайсці ў сталовую;
3) пазычыць дзве тысячы рублёў;
4) паранены баец;
5) распытаць параненага.
***2. Адзначце агульныя назоўнікі:***
1) "Вавёрка" (цукеркі);
2) Свіцязь;
3) мецэнат;
4) аўтамабіль;
5) Хрышчэнне.
***3. Адзначце ўласныя назоўнікі:***
1) (Г, г)арлахвацкія;
2) (Р, р)эвалюцыя;

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

3) (В, в)іцебшчына);
4) (К, к)аляды)
5) браты (А, а)сіпенкі.

***4. Адзначце канкрэтныя назоўнікі:***

1) удача;
2) дождж;
3) карта;
4) адведзіны;
5) цярпенне.

***5. Адзначце абстрактныя назоўнікі:***

1) вернасць;
2) перагаворы;
3) умова;
4) грэчка;
5) жаўцізна.

***6. Адзначце адушаўлёныя назоўнікі:***

1) карп (заліўны);
2) моладзь;
3) клён;
4) пешка;
5) парашутыст.

***7. Адзначце неадушаўлёныя назоўнікі:***

1) тапелец;
2) русалка;
3) атрад;
4) снегавік;
5) рамонак.

***8. Адзначце зборныя назоўнікі:***

1) духавенства;
2) мастацтва;
3) каштаны;
4) насенне;
5) звяр'ё.

***9. Адзначце рэчыўныя назоўнікі:***

1) плюш;
2) тлушч;
3) асіннік;
4) садаводства;
5) крупы.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

***10. Адзначце адзінкавыя назоўнікі:***

1) травінка;
2) дажджынка;
3) разводдзе;
4) лыжа;
5) саломіна.

## НАЗОЎНІК: РОД І ЛІК НАЗОЎНІКАЎ

### Варыянт 1

***1. Адзначце назоўнікі, якія змяняюцца па ліках:***

1) гульня;
2) сумёты;
3) апілкі;
4) шахматы;
5) заўвага.

***2. Адзначце назоўнікі, для якіх характэрна толькі форма адзіночнага ліку:***

1) чарніла;
2) прадчуванне;
3) салома;
4) абутак;
5) асаблівасць.

***3. Адзначце назоўнікі, для якіх характэрна толькі форма множнага ліку:***

1) турботы;
2) шкарпэткі;
3) вясніцы;
4) дровы;
5) сняжынкі.

***4. Адзначце назоўнікі, лік якіх адрозніваецца ў беларускай і рускай мовах:***

1) дрова;
2) каникулы;
3) ворота;
4) крупа;
5) дверь.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

***5. Адзначце назоўнікі мужчынскага роду:***
1) мікада;
2) боты;
3) лясгас;
4) тарнада;
5) Асіповічы.

***6. Адзначце назоўнікі агульнага роду:***
1) інжынер;
2) стараста;
3) хвалько;
4) дэпутат;
5) соня.

***7. Адзначце назоўнікі, якія не маюць роду:***
1) абставіны;
2) сані;
3) гарады;
4) жалюзі;
5) СМІ.

***8. Адзначце назоўнікі, род якіх адрозніваецца ў беларускай і рускай мовах:***
1) пачка (печенья);
2) бровь;
3) глубь;
4) верфь;
5) глушь.

***9. Адзначце словазлучэнні, у якіх прыметнік правільна дапасаваны да назоўніка:***
1) гуллівая кацяня;
2) далёкі поўнач;
3) прыгожае Нарач;
4) моцны тарнада;
5) цікавы ЛіМ.

***10. Устанавіце адпаведнасць паміж назоўнікам і яго характарыстыкай:***

| | |
|---|---|
| А: Клімавічы | 1. Назоўнік агульнага роду. |
| Б: Гобі | 2. Назоўнік мужчынскага роду. |
| В: завуч | 3. Назоўнік жаночага роду. |
| Г: кураняты | 4. Назоўнік не мае роду. |
| Д: гваздзікі | 5. Назоўнік ніякага роду. |



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## НАЗОЎНІК: РОД І ЛІК НАЗОЎНІКАЎ

### Варыянт 2

***1. Адзначце назоўнікі, якія змяняюцца па ліках:***

1) настрой;
2) смеласць;
3) выбары (дэпутацкія);
4) вокладка;
5) перапынак.

***2. Адзначце назоўнікі, для якіх характэрна толькі форма адзіночнага ліку:***

1) абавязак;
2) сумленне;
3) пер'е;
4) стрэмя;
5) шлях.

***3. Адзначце назоўнікі, для якіх характэрна толькі форма множнага ліку:***

1) лыжы;
2) панчохі;
3) вароты;
4) вочы;
5) грудзі.

***4. Адзначце назоўнікі, лік якіх адрозніваецца ў беларускай і рускай мовах:***

1) опилки;
2) дрожжи;
3) привидение;
4) поведение;
5) конопля.

***5. Адзначце назоўнікі мужчынскага роду:***

1) ханжа;
2) сулугуні;
3) рыбгас;
4) залежы;
5) БАМ.

***6. Адзначце назоўнікі агульнага роду:***

1) поні;
2) выскачка;

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

3) Шура;
4) інжынер;
5) дзіця.

***7. Адзначце назоўнікі, якія не маюць роду:***

1) абцугі;
2) хрэсьбіны;
3) таполі;
4) асарці;
5) ЗША.

***8. Адзначце назоўнікі, род якіх адрозніваецца ў беларускай і рускай мовах:***

1) жираф;
2) шампунь;
3) щука;
4) ширь;
5) Сибирь.

***9. Адзначце словазлучэнні, у якіх прыметнік правільна дапасаваны да назоўніка:***

1) прыўзнятая броў;
2) ваенны аташэ;
3) далёкія Чылі;
4) смачны сулугуні;
5) строгае ДАІ.

***10. Устанавіце адпаведнасць паміж назоўнікам і яго характарыстыкай:***

| | |
|---|---|
| А: шымпанзэ | 1. Назоўнік агульнага роду. |
| Б: лясгас | 2. Назоўнік мужчынскага роду. |
| В: птушаняты | 3. Назоўнік жаночага роду. |
| Г: рамонкі | 4. Назоўнік не мае роду. |
| Д: прамоўца | 5. Назоўнік ніякага роду. |

## НАЗОЎНІК: СКЛАНЕННЕ НАЗОЎНІКАЎ

### Варыянт 1

***1. Адзначце назоўнікі І скланення:***

1) ханжа;
2) Святлана;
3) Віця;



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

4) Ілья;
5) раса.

***2. Адзначце назоўнікі II скланення:***
1) вымя;
2) племя;
3) птушаня;
4) неба;
5) жалеза.

***3. Адзначце назоўнікі III скланення:***
1) медалі;
2) роспач;
3) кужаль;
4) жырафы;
5) Свіцязь.

***4. Адзначце рознаскланяльныя назоўнікі:***
1) сведка;
2) тамада;
3) Кузьма;
4) Пеця;
5) цемя.

***5. Устанавіце адпаведнасць паміж назоўнікам і яго скланеннем:***

| | |
|---|---|
| А: бярэмя | 1. I скланенне. |
| Б: старшына | 2. II скланенне. |
| В: суткі | 3. III скланенне. |
| Г: боты | 4. Рознаскланяльны. |
| Д: піяніна | 5. Нескланяльны. |
| | 6. Множналікавы назоўнік. |
| | 7. Ад'ектыўны тып (як прыметнік). |
| | 8. Змешаны тып скланення. |

***6. Адзначце назоўнікі, скланенне якіх вызначана правільна:***
1) прамоўца (I скланенне);
2) мядзведзь (II скланенне);
3) дзеячы – множналікавы;
4) паліто – II скланенне;
5) калібры – нескланяльны.

***7. Адзначце назоўнікі, скланенне якіх адрозніваецца ў беларускай і рускай мовах:***
1) дедушка;
2) имя;



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

3) пламя;

4) путь;

5) ширь.

***8. Адзначце назоўнікі, якія ў родным склоне адзіночнага ліку маюць канчаткі -а (-я):***

1) кветнік;

2) брыво;

3) стогн;

4) край;

5) пераможца.

***9. Адзначце назоўнікі, якія ў родным склоне адзіночнага ліку маюць канчаткі -у (-ю):***

1) май;

2) поўдзень;

3) твар;

4) матч;

5) футбол.

***10. Адзначце назоўнікі, у якіх у творным склоне адзіночнага ліку адбываецца падаўжэнне зычных асновы:***

1) злосць;

2) замець;

3) шампунь;

4) роўнядзь;

5) дзесяць.

***11. Адзначце назоўнікі, якія ў творным склоне адзіночнага ліку маюць канчаткі -ым (-ім):***

1) Іванам (Рагачоў);

2) вёска пад (Рагачоў);

3) Барысам (Пятроў);

4) горадам (Крычаў);

5) бітва пад (Валожын).

***12. Адзначце назоўнікі, у якіх у месным склоне адзіночнага ліку адбываюцца чаргаванні зычных:***

1) адліга;

2) парад;

3) пяцёрка;

4) мурог;

5) страх.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

***13. Адзначце назоўнікі, якія ў месным склоне адзіночнага ліку маюць канчаткі -у (-ю):***

1) вязень;
2) марак;
3) рукапіс;
4) конь;
5) відэлец.

***14. Адзначце назоўнікі, якія ў месным склоне адзіночнага ліку маюць канчатак -е:***

1) свет;
2) чарэшня;
3) падлога;
4) меркаванне;
5) здароўе.

***15. Адзначце назоўнікі, якія ў месным склоне адзіночнага ліку маюць канчаткі -і (-ы):***

1) хімія;
2) завуч;
3) завушніца;
4) сваячка;
5) маэстра.

***16. Адзначце назоўнікі, якія ў маюць канчаткі -ам (-ям):***

1) па (старонкі) летапісу;
2) на радасць (бацькі);
3) дапамагчы (сябры);
4) падарожжа па (гарады);
5) пабегаць па (кабінеты).

***17. Адзначце назоўнікі, склонавыя формы якіх запісаны правільна:***

1) гаварыць па селектары;
2) жыць у Жодзіна;
3) стаяць каля пад'езду;
4) напісаць Віцю;
5) сказаць дзядулі.

***18. Адзначце сказы, у якіх два назоўнікі ўжыты ў форме аднаго і таго ж склону:***

1) Мова – гэта адна з найважнейшых прыкмет нацыі.

2) Падарыць кветкі – гэта значыць выказаць чалавеку шчырае пачуццё павагі.

3) Даша, у мяне ёсць да цябе дзве просьбы.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

4) Са свайго акна я добра бачу футбольнае поле.
5) З дзецьмі трэба гаварыць на зразумелай для іх мове.

***19. Адзначце словазлучэнні, у якіх пры напісанні формы назоўніка дапушчана граматычная памылка:***

1) нага ў стрэмі;
2) папрасіць дзіця;
3) зламаныя голлі;
4) падзякаваць сястру;
5) аб калезе Пятровай.

***20. Устанавіце адпаведнасць паміж назоўнікам і яго канчаткам у форме меснага склону:***

| | |
|---|---|
| А: дачка | 1) -е; |
| Б: арэх | 2) -э; |
| В: гусь | 3) -ы; |
| Г: мядзведзь | 4) -і; |
| Д: дзіця | 5) -у; |
| | 6) -ю. |

## НАЗОЎНІК: СКЛАНЕННЕ НАЗОЎНІКАЎ

### Варыянт 2

***1. Адзначце назоўнікі І скланення:***

1) сяброўства;
2) тамада;
3) маці;
4) сёстры;
5) Кузьма.

***2. Адзначце назоўнікі ІІ скланення:***

1) жарабя;
2) лівень;
3) пярсцёнкі;
4) цемя;
5) лекі.

***3. Адзначце назоўнікі ІІІ скланення:***

1) СНД;
2) вусень;
3) здань;
4) палын;
5) моц.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

***4. Адзначце рознаскланяльныя назоўнікі:***

1) дзетвара;
2) пераҗытае;
3) стараста;
4) Слава;
5) ляўша.

***5. Устанавіце адпаведнасць паміж назоўнікам і яго скланеннем:***

| | |
|---|---|
| А: танга | 1. I скланенне. |
| Б: Свіслач | 2. II скланенне. |
| В: дроб | 3. III скланенне. |
| Г: зубраня | 4. Рознаскланяльны. |
| Д: вятрыска | 5. Нескланяльны. |
| | 6. Множналікавы тып скланення. |
| | 7. Субстантыўны тып (як прыметнік). |
| | 8. Змешаны тып скланення. |

***6. Адзначце назоўнікі, скланенне якіх вызначана правільна:***

1) калега (рознаскланяльны);
2) цяжар (III скланенне);
3) кужаль (III скланенне);
4) цень (II скланенне);
5) сірата (I скланенне).

***7. Адзначце назоўнікі, скланенне якіх адрозніваецца ў беларускай і рускай мовах:***

1) верфь;
2) степь;
3) ребёнок;
4) сюрприз;
5) имя.

***8. Адзначце назоўнікі, якія ў родным склоне адзіночнага ліку маюць канчаткі -а (-я):***

1) жалеза;
2) немаўля;
3) вынаходца;
4) боль;
5) шчаўе.

***9. Адзначце назоўнікі, якія ў родным склоне адзіночнага ліку маюць канчаткі -у (-ю):***

1) хакей;
2) захад;



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

3) суфікс;

4) метр;

5) подпіс.

***10. Адзначце назоўнікі, у якіх у творным склоне адзіночнага ліку адбываецца падаўжэнне зычных асновы:***

1) косць;

2) безліч;

3) дваццаць;

4) запаведзь;

5) рэч.

***11. Адзначце назоўнікі, якія ў творным склоне адзіночнага ліку маюць канчаткі -ым (-ім):***

1) ганаруся горад (Барысаў);

2) за (Барысаў) павінен стаць Іваноў;

3) пад сялом (Сноў);

4) Пятром (Сноў);

5) дырэктарам (Петрыкаў).

***12. Адзначце назоўнікі, у якіх у месным склоне адзіночнага ліку адбываюцца чаргаванні зычных:***

1) рагатуха;

2) білет;

3) тварог;

4) астрог;

5) адзінка.

***13. Адзначце назоўнікі, якія ў месным склоне адзіночнага ліку маюць канчаткі -у (-ю):***

1) паэт;

2) продаж;

3) кухар;

4) малако;

5) спявак.

***14. Адзначце назоўнікі, якія ў месным склоне адзіночнага ліку маюць канчатак -е:***

1) далягляд;

2) інтрыга;

3) сакратарка;

4) піяніна;

5) Таня.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

***15. Адзначце назоўнікі, якія ў месным склоне адзіночнага ліку маюць канчаткі -і (-ы):***

1) цёзка (Наташа);
2) змагар;
3) кураня;
4) пажарышча;
5) псіхолаг.

***16. Адзначце назоўнік(і), які(я) мае (маюць) канчаткі -ам (-ям):***

1) скардзіцца (суседзі);
2) ехаць па (Карэлічы);
3) жыць пры (дзеці);
4) ударыць па (клавішы);
5) сумаваць па (Клімавічы).

***17. Адзначце назоўнікі, склонавыя формы якіх запісаны правільна:***

1) зайсці без пропуска;
2) адпачываць на морэ;
3) бегчы за Алёшам;
4) выйсці з дома;
5) холадна на двары.

***18. Адзначце сказы, у якіх два назоўнікі ўжыты ў форме аднаго і таго ж склону:***

1) Павел, куды ты паклаў свой сшытак?
2) Прайшло ўжо тры дні, а пісьма ўсё няма.
3) Дзіма, у цябе веласіпед новы?
4) Па сцяжынцы ідзе і ўсё на спінцы нясе.
5) Мы спрабуем развіваць навыкі правапісу.

***19. Адзначце словазлучэнні, у якіх пры напісанні формы назоўніка дапушчана граматычная памылка:***

1) убачыць па тэлевізару;
2) асеннія лісці;
3) даць вады цыляці;
4) пасварыцца з Валей;
5) са студэнтам Нежкавым Рыгорам.

***20. Устанавіце адпаведнасць паміж назоўнікам і яго канчаткам у форме меснага склону:***

| | |
|---|---|
| А: талака | 1) -е; |
| Б: каўнер | 2) -э; |
| В: атлетыка | 3) -ы; |
| Г: позірк | 4) -і; |
| Д: герой | 5) -у; |
| | 6) -ю. |



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

# ПРАВАПІС СКЛАДАНЫХ НАЗОЎНІКАЎ. ПРАВАПІС СУФІКСАЎ НАЗОЎНІКАЎ

## Варыянт 1

***1. Адзначце назоўнікі, якія пішуцца разам:***

1) (паў) Беларусі;
2) (паў) лімона;
3) (паў) апельсіна;
4) (жалеза) бетон;
5) (міні) рынак.

***2. Адзначце назоўнікі, якія пішуцца праз злучок:***

1) (метэа) станцыя;
2) (пакаці) гарошак;
3) (чалавека) ложак;
4) (школа) студыя;
5) (норд) ост.

***3. Адзначце правільна напісаныя назоўнікі:***

1) пед-каледж;
2) экспрэс-кафэ;
3) вей-вецер;
4) грос-майстар;
5) віцэ-консул.

***4. Адзначце няправільна напісаныя назоўнікі:***

1) мікраэлементы;
2) сель-савет;
3) гары-цвет;
4) аграгарадок;
5) унтэрафіцэр.

***5. Адзначце назоўнікі, у якіх на месцы пропуску пішацца літара Ш:***

1) перапі…чык;
2) перабе…чык;
3) абліцоў…чык;
4) пай…чык;
5) пака…чык.

***6. Адзначце назоўнікі, у якіх на месцы пропуску пішацца літара Ц:***

1) тка…тва;
2) суce…тва;
3) бра…тва;



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

4) праро…тва;
5) парахо…тва.
***7. Адзначце назоўнікі, у якіх на месцы пропуску пішацца мяккі знак:***
1) жэтон…чык;
2) павільён…чык;
3) чарэшан…ка;
4) лазен…ка;
5) песен… .
***8. Адзначце правільна напісаныя назоўнікі:***
1) відэазамалёўка;
2) праснічка;
3) контрпрапанова;
4) максімода;
5) салдаччына.
***9. Адзначце няправільна напісаны(я) назоўнік(і):***
1) каменьшчык;
2) клубеньчык;
3) вузельчык;
4) падманшчык;
5) Полаччына.
***10. Адзначце назоўнікі, у якіх пішацца -ЫК:***
1) кулонч(ык, ак);
2) месяч(ык, ак);
3) кружоч(ык, ак);
4) дружоч(ык, ак);
5) балонч(ык, ак).

## ПРАВАПІС СКЛАДАНЫХ НАЗОЎНІКАЎ. ПРАВАПІС СУФІКСАЎ НАЗОЎНІКАЎ

### Варыянт 2

***1. Адзначце назоўнікі, якія пішуцца разам:***
1) (паў) вагона;
2) (паў) Магілёва;
3) (супер) ігра;
4) (контр) ідэя;
5) (контр) адмірал.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

***2. Адзначце назоўнікі, якія пішуцца праз злучок:***
1) (праца) дзень;
2) (самалёта) вылет;
3) (мікра) космас;
4) (гран) пры;
5) (вярні) дуб.
***3. Адзначце правільна напісаныя назоўнікі:***
1) тонакіламетр;
2) стэрэасістэма;
3) канферэнц-зала;
4) над Арэсай-ракой;
5) над ракой-Арэсай.
***4. Адзначце няправільна напісаныя назоўнікі:***
1) дуб велікан;
2) прэсслужба;
3) ліберал-рэфарміст;
4) контр-атака;
5) паўпакоя.
***5. Адзначце назоўнікі, у якіх на месцы пропуску пішацца літара Т:***
1) пераплё…чык;
2) старасве…чына;
3) Турэ…чына;
4) Пола…чына;
5) рэкру…чына.
***6. Адзначце назоўнікі, у якіх на месцы пропуску пішацца літара Ц:***
1) аген…тва;
2) каталі…тва;
3) самаўла…тва;
4) сабаляво…тва;
5) неву…тва.
***7. Адзначце назоўнікі, у якіх на месцы пропуску пішацца мяккі знак:***
1) парасон…чык;
2) крамен…чык;
3) вішан…ка;
4) соцен…;
5) балон…чык.
***8. Адзначце правільна напісаныя назоўнікі:***
1) сеелка;
2) дробязь;



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

3) мыльнечка;
4) Брэшчына;
5) сарвігалава.

***9. Адзначце няправільна напісаныя назоўнікі:***

1) птаства;
2) ашчад-банк;
3) ільно-валакно;
4) паўузвод;
5) напаўкалонія.

***10. Адзначце назоўнікі, у якіх пішацца -АК:***

1) каласоч(ык, ак);
2) беражоч(ык, ак);
3) акрайч(ык, ак);
4) арэш(ык, ак);
5) пянёч(ык, ак).

## ПРЫМЕТНІК: РАЗРАДЫ ПРЫМЕТНІКАЎ

### Варыянт 1

***1. Адзначце прыметнікі:***

1) шумны;
2) усякі;
3) стомлены;
4) балючы;
5) першы.

***2. Адзначце прыметнікі, ужытыя ў пачатковай форме:***

1) сціплага;
2) даверлівы;
3) горшы;
4) падкрэслены;
5) адважны.

***3. Адзначце словазлучэнні з якаснымі прыметнікамі:***

1) салёнае цеста;
2) неаглядная прастора;
3) чорная металургія;
4) позні прыезд;
5) вішнёвы кампот.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

***4. Адзначце словазлучэнні з адноснымі прыметнікамі:***
1) васільковыя вочы;
2) калядныя вячоркі;
3) чужая кішэня;
4) марозны дзень;
5) птушынае царства.

***5. Адзначце словазлучэнні з прыналежнымі прыметнікамі:***
1) матчын успамін;
2) лісіны каўнер;
3) Купалавы творы;
4) Аленчына школа;
5) генеральскі шынель.

***6. Адзначце словазлучэнні, у якіх адносныя прыметнікі ўжытыя ў значэнні якасных:***
1) кіргізскі эпас;
2) шаўковыя валасы;
3) лёгкая атлетыка;
4) дубовая галава;
5) іржавая лістота.

***7. Адзначце словазлучэнні, у якіх якасныя прыметнікі ўжытыя ў значэнні адносных:***
1) летняя вада;
2) малінавы джэм;
3) звонкія зычныя;
4) сухое віно;
5) светлы позірк.

***8. Адзначце назоўнікі, ад якіх утвараюцца прыметнікі пры дапамозе суфіксаў -ЫН, -ІН:***
1) Маша;
2) Міша;
3) Коля;
4) Вера;
5) дзядуля.

***9. Адзначце назоўнікі, ад якіх утвараюцца прыметнікі пры дапамозе суфіксаў -АЎ, -ЕЎ, -ЁЎ:***
1) Міхась;
2) Зоя;
3) воўк;
4) Алег;
5) брат.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

***10. Устанавіце адпаведнасць паміж прыметнікамі і іх разрадамі:***

А: круглы стол
Б: мядзведжая паходка
В: босы хлопчык
Г: арэхавы кій
Д: матчыны ўспаміны
Е: студэнцкі інтэрнат

1) якасны;
2) адносны;
3) прыналежны.

## ПРЫМЕТНІК: РАЗРАДЫ ПРЫМЕТНІКАЎ

### Варыянт 2

***1. Адзначце прыметнікі:***
1) іншы;
2) важны;
3) строгі;
4) адзінокі;
5) пакрыўджаны.

***2. Адзначце прыметнікі, ужытыя ў пачатковай форме:***
1) большы;
2) воўчы;
3) дарожным;
4) непрыкметны;
5) разбіты.

***3. Адзначце словазлучэнні з якаснымі прыметнікамі:***
1) салодкая груша;
2) алавянае сэрца;
3) абыякавыя адносіны;
4) каляровыя металы;
5) ластаўчына гняздо.

***4. Адзначце словазлучэнні з адноснымі прыметнікамі:***
1) драпежны звер;
2) бяздонныя вочы;
3) дажджавая вільгаць;
4) леташні ўраджай;
5) каляровая сукенка.

***5. Адзначце словазлучэнні з прыналежнымі прыметнікамі:***
1) тутэйшыя мясціны;
2) кляновы сок;

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

3) дзіцячы сад;
4) Славікаў характар;
5) мядзведжая лапа.

***6. Адзначце словазлучэнні, у якіх адносныя прыметнікі ўжытыя ў значэнні якасных:***

1) рысавыя крупы;
2) непраглядная цемра;
3) крыштальнае сумленне;
4) іржавы цвік;
5) восеньскі настрой.

***7. Адзначце словазлучэнні, у якіх якасныя прыметнікі ўжытыя ў значэнні адносных:***

1) белы хлеб;
2) шчырая ўсмешка;
3) капіравальная машына;
4) цяжкая атлетыка;
5) залатое сэрца.

***8. Адзначце назоўнікі, ад якіх утвараюцца прыметнікі пры дапамозе суфіксаў -ЫН, -ІН:***

1) бабуля;
2) Ваня;
3) Даша;
4) ластаўка;
5) Пецця.

***9. Адзначце назоўнікі, ад якіх утвараюцца прыметнікі пры дапамозе суфіксаў -АЎ, -ЕЎ, -ЁЎ:***

1) Павел;
2) Сяргей;
3) сусед;
4) вярблюд;
5) дзіця.

***10. Устанавіце адпаведнасць паміж прыметнікамі і іх разрадамі:***

| | |
|---|---|
| А: бамбукавае вудзільна | 1) якасны; |
| Б: коцікавае манто | 2) адносны; |
| В: позні званок | 3) прыналежны. |
| Г: салдацкі шынель | |
| Д: сопкая бульба | |
| Е: Алесеў дзённік | |

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

# ПРЫМЕТНІК:
# ПОЎНАЯ, КАРОТКАЯ, СЦЯГНУТАЯ ФОРМА

## Варыянт 1

***1. Адзначце прыметнікі, якія могуць мець кароткую форму:***

1) свежы;
2) доўгі;
3) вераснёвы;
4) Паўлаў;
5) малы.

***2. Адзначце прыметнікі, якія не маюць кароткай формы:***

1) адпаведны;
2) лішні;
3) шырокі;
4) своечасовы;
5) белы.

***3. Адзначце сказы, у якіх прыметнікі выконваюць функцыю выказніка:***

1) З-за хмар выплывала на блакітную столь велічнае сонца (А. Асіпенка).

2) Вясна ступіла на рачулку, і гулкі крок яе чуцён – браню зімы скідае гулка, бярэ да квецені разгон (П. Броўка).

3) Была цёплая раніца.

4) Раніца была цёплая.

5) Корань навукі горкі, ды плод яго салодкі (Прыказка).

***4. Адзначце сказы, у якіх прыметнікі выконваюць функцыю азначэння:***

1) Малы жук, ды вялікі гук (Прыказка).

2) Крывое ды дзіравае выпраўляць цяжка (Прыказка).

3) Лісце было амаль сухое.

4) Навокал, вельмі блізка, у траве сакаталі нябачныя конікі.

5) У пакоі непрыбрана, на падлозе валяюцца розныя рэчы.

***5. Адзначце сказы, у якіх выкарыстаны прыметнікі сцягнутай формы:***

1) Распусціла дзяўчына косы доўгі свае.

2) Недзе далёка ў небе адыходзілі журавы; іх галасы былі ледзь чутны (А. Кудравец).

3) З плеч спадаюць яе косы, нібы сонца косы, і іскрацца, як на сонцы брыльянцісты росы (Я. Купала).

4) Дзякуй Богу, здарова. За мяне не хвалюйся (Я. Янішчыц).

5) Беларусь! Як ты дарага мне, як нішто і ніколі ў жыцці (П. Броўка).



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

***6. Адзначце сказы, у якіх выкарыстаны прыметнікі кароткай формы:***

1) А дзявочу красу, нібы тую расу, піў цагляны падвал цёмнай ночы (Я. Купала).

2) Пеця заўсёды гатоў прыйсці на дапамогу.

3) У шафе вісела сестрыно паліто.

4) Недахопы відавочны нават для неспецыяліста.

5) Ой, няшчасна Бандароўна, адпачні часіну (Я. Купала).

***7. Устанавіце адпаведнасць паміж прыметнікам і яго характарыстыкай:***

| | |
|---|---|
| А: повен дом гасцей | 1) прыметнік ужыты ў поўнай форме; |
| Б: дзеці рады | 2) прыметнік ужыты ў кароткай форме; |
| В: Аленчына дапамога | 3) прыметнік ужыты ў сцягнутай форме. |
| Г: мядзведжы след | |
| Д: сарамліва бярозка | |

***8. Адзначце прыметнікі, пададзеныя ў пачатковай форме:***

1) перапёлчын;
2) пазнейшы;
3) старанны;
4) падкрэслены;
5) стомленыя.

***9. Адзначце няправільна напісаныя прыметнікі:***

1) Мішын партфель;
2) сабакава будка;
3) сестрыно паліто;
4) суседкін агарод;
5) зязюльчына кукаванне.

***10. Адзначце правільна ўтвораныя і запісаныя прыметнікі:***

1) вярблюжы горб;
2) доччына ўсмешка;
3) Пецеў альбом;
4) матчыныя сёстры;
5) Веранічыны алоўкі.

## ПРЫМЕТНІК: ПОЎНАЯ, КАРОТКАЯ, СЦЯГНУТАЯ ФОРМА

### Варыянт 2

***1. Адзначце прыметнікі, якія могуць мець кароткую форму:***

1) барадаты;



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

2) зялёны;
3) свежы;
4) караткаваты;
5) лясісты.

***2. Адзначце прыметнікі, якія не маюць кароткай формы:***
1) белы;
2) аксамітны;
3) жалезны;
4) Марынчын;
5) гучны.

***3. Адзначце сказы, у якіх прыметнікі выконваюць функцыю выказніка (уваходзяць у састаў выказніка):***
1) Самыя ціхія – сцежкі дубровы.
2) Антон быў старэйшы за ўсіх у сям'і.
3) Сын, хоць і здаваўся спакайнейшым за бацьку, запаліўся спрэчкаю.
4) Ручнік пах мёдам, і дажджом, і сонечным паветрам.
5) Раскласці вогнішча – справа нялёгкая.

***4. Адзначце сказы, у якіх прыметнікі выконваюць функцыю азначэння:***
1) Малы залатнік, ды дарагі (Прыказка).
2) Дождж паменшаў,стаў драбнейшым, радзейшым.
3) А над гарой Дняпровы хвалі з вясны да восені шумяць (Я. Купала).
4) Старшы лейтэнант адразу пачаў збірацца.
5) Машы захацелася ўмяшацца і сказаць нешта значнае, разумнае.

***5. Адзначце сказы, у якіх выкарыстаны прыметнікі сцягнутай формы:***
1) І не сабака страшан воўку, калі прыйшлося сказаць к слоўку, мой пане-браце, мой Марцяга, а непрыемна яго звяга (Я. Колас).
2) Люблю паслухаць на зары я спевы жаўруковы.
3) Рабочыя прыладзілі на камянях вялікі кацёл з асфальтам.
4) Лазнякі прырэчны сустракаюць шумам.
5) Снег, бы вата бялютка, ляжыць на траве і кустах.

***6. Адзначце сказы, у якіх выкарыстаны прыметнікі кароткай формы:***
1) У пачатку чэрвеня ўсё молада, пышна, зелена.
2) У голлі дрэў чуваць птушыны песні.
3) У сярэдзіне лета ў маленькім бабуліным доміку пасяліўся кватарант (А. Васілевіч).
4) Беласнежны пярыны заслалі і горы, і долы.
5) "Вельмі рада бачыць цябе" – усміхнулася Аленка.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*7. Устанавіце адпаведнасць паміж прыметнікам і яго характарыстыкай:*

| | |
|---|---|
| А: хлопчык яшчэ мал | 1) прыметнік ужыты ў поўнай форме; |
| Б: вучні актыўныя | 2) прыметнік ужыты ў кароткай форме; |
| В: Сярожаў дзённік | 3) прыметнік ужыты ў сцягнутай форме. |
| Г: воўчы апетыт | |
| Д: цёмная ноч | |

*8. Адзначце прыметнікі, пададзеныя ў пачатковай форме:*

1) суседскі;
2) суседаў;
3) горшы;
4) звычайным;
5) ровен.

*9. Адзначце няправільна напісаныя прыметнікі:*

1) Валіна пісьмо;
2) Ваніна падарожжа;
3) мядзвежы след;
4) Васева знаходка;
5) вавёркавае футра.

*10. Адзначце правільна ўтвораныя і запісаныя прыметнікі:*

1) вярблюджы горб;
2) авечая шэрсць;
3) Сярожына здагадка;
4) ваўчыныя сляды;
5) Кацiны вочы.

## ПРЫМЕТНІК: СТУПЕНІ ПАРАЎНАННЯ ПРЫМЕТНІКАЎ

### Варыянт 1

*1. Адзначце прыметнікі вышэйшай ступені параўнання:*

1) найцяплейшы;
2) больш поўна;
3) надзвычай ціхі;
4) багацейшы;
5) менш адказны.

*2. Адзначце прыметнікі найвышэйшай ступені параўнання:*

1) самы прывабны;
2) найлепшы;



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

3) найлягчэйшы;

4) найменш зручна;

5) вельмі цікавы.

***3. Адзначце прыметнікі простай формы вышэйшай ступені параўнання:***

1) меншы;

2) радзейшы;

3) найсаладзейшы;

4) маленькі;

5) больш дробны.

***4. Адзначце прыметнікі складанай формы вышэйшай ступені параўнання:***

1) менш актыўны;

2) найбольш грунтоўны;

3) самы адметны;

4) больш значны;

5) больш прыстойна.

***5. Адзначце прыметнікі простай формы найвышэйшай ступені параўнання:***

1) наймякчэй;

2) бялюткі;

3) смачнейшы;

4) наймілейшы;

5) найбольшы.

***6. Адзначце прыметнікі складанай формы найвышэйшай ступені параўнання:***

1) больш яркі;

2) зусім светлы;

3) найбагацейшы;

4) самы старанны;

5) найменш вядомы.

***7. Адзначце правільна ўтвораныя формы ступеняў параўнання прыметнікаў:***

1) больш важнейшы;

2) самы прывабны;

3) найбольш адпаведны;

4) найгоршы;

5) найменш святлейшы.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

***8. Адзначце няправільна ўтвораныя формы ступеняў параўнання прыметнікаў:***

1) больш васільковы;
2) больш чорны;
3) больш актыўны;
4) больш цяплейшы;
5) больш вусаты.

***9. Адзначце сказы, у якіх ступені параўнання прыметнікаў ужыты правільна:***

1) Тут смех і жарты, таўканіна – цікавейшая часіна!
2) Муж гаспадыні быў старэйшы за яе гадоў на пятнаццаць.
3) Сярожа бачыў бліжэйшую да акон частку падлогі на першым паверсе.
4) Травы ачысцяцца, дрэвы памыюцца, лівень не зломіць іх – стануць дужэй.
5) На свеце лепшага кутка няма, чым той, дзе маці нарадзіла.

***10. Адзначце сказы з памылковым ужываннем ступеняў параўнання прыметнікаў:***

1) Не ўсе ведаюць, што граб цвярдзей іншых дрэў.
2) Душа чалавека мудрэйшая за розум яго.
3) Мікола Гусоўскі – наш самы найбуйнейшы паэт-лацініст.
4) У гэтым годзе бульба ў нас большая і смачнейшая, чым у мінулым.
5) Старэйшыя мяне сёстры ўжо даўно замужам.

## ПРЫМЕТНІК: СТУПЕНІ ПАРАЎНАННЯ ПРЫМЕТНІКАЎ

### Варыянт 2

***1. Адзначце прыметнікі вышэйшай ступені параўнання:***

1) абсалютна спакойны;
2) цяплей;
3) больш гаваркі;
4) мякчэйшы;
5) менш цікаўны.

***2. Адзначце прыметнікі найвышэйшай ступені параўнання:***

1) найбольш адказны;
2) самы малады;
3) занадта цікаўны;
4) найменш хутка;
5) найгусцейшы.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

***3. Адзначце прыметнікі простай формы вышэйшай ступені параўнання:***

1) вялізны;
2) спакайней;
3) найменшы;
4) слабейшы;
5) навейшы.

***4. Адзначце прыметнікі складанай формы вышэйшай ступені параўнання:***

1) самы лясісты;
2) вельмі адчайны;
3) больш спакойна;
4) менш верагодны;
5) больш сакавіты.

***5. Адзначце прыметнікі простай формы найвышэйшай ступені параўнання:***

1) шырачэзны;
2) наймацнейшы;
3) самы дарагі;
4) найдужэй;
5) найніжэйшы.

***6. Адзначце прыметнікі складанай формы найвышэйшай ступені параўнання:***

1) найбольш спагадлівы;
2) самы позні;
3) найменш крохкі;
4) найбольш ярка;
5) найменш выразна.

***7. Адзначце правільна ўтвораныя формы ступеняў параўнання прыметнікаў:***

1) самы найярчэйшы;
2) самы смялейшы;
3) самы глыбокі;
4) больш гучна;
5) чысцейшы.

***8. Адзначце няправільна ўтвораныя формы ступеняў параўнання прыметнікаў:***

1) наймаладзейшы;
2) самы крыклівы;



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

3) больш смачны;

4) самы туманны;

5) больш барадаты.

***9. Адзначце сказы, у якіх ступені параўнання прыметнікаў ужыты правільна:***

1) Нашы дзяўчаты больш прыгажэйшыя за вашых.

2) На свеце, мусіць, нічога няма мацней за прывычку.

3) Рукі, у якія ўелася столькі зямлі, – найчысцейшыя рукі на свеце.

4) Дарога дадому заўсёды карацей.

5) Найпрыгажэйшы чалавек бывае тады, калі ён не ведае пра гэта.

***10. Адзначце сказы з памылковым ужываннем ступеняў параўнання прыметнікаў:***

1) Таня маладзейшая ад Аленкі.

2) Чым больш касіў, тым цяжэй станавілася каса.

3) Андрэй – найбольш дапытлівы з усіх вучняў.

4) Праспекты і вуліцы новых гарадоў шырэйшыя, прасторнейшыя, чым сарыя, даваенныя.

5) Верхавіна клёна стала вышэй за дах нашага дома.

## ПРАВАПІС СКЛАДАНЫХ ПРЫМЕТНІКАЎ. ПРАВАПІС СУФІКСАЎ ПРЫМЕТНІКАЎ

### Варыянт 1

***1. Адзначце прыметнікі, якія пішуцца разам:***

1) чырвона/цагляны дом;

2) Заходне/Еўрапейская нізіна;

3) кансультатыўна/дыягнастычны цэнтр;

4) спрадвечна/беларускія словы;

5) маральна/устойлівы грамадзянін.

***2. Адзначце прыметнікі, якія пішуцца праз злучок:***

1) шэра/мармуровыя пліты;

2) заходне/еўрапейскія краіны;

3) палацава/паркавы ансамбль;

4) абсалютна/спакойны;

5) паўднёва/ўсходні вецер.

***3. Адзначце правільна напісаныя прыметнікі:***

1) лацінаамерыканскі;

2) паўднёва-заходні;



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

3) паўднёваўкраінскі;
4) кандратакрапівоўскі;
5) сацыял-дэмакратычны.

***4. Адзначце няправільна напісаныя прыметнікі:***
1) мякка-шэрсны;
2) гістарычна-краязнаўчы;
3) віцэгубернатарскі;
4) напаўдрымотны;
5) глеба-апрацоўчы.

***5. Адзначце прыметнікі, у якіх трэба ўставіць літару Ц:***
1) аген…кі;
2) буйні…кі;
3) Нью-Ёр…кі;
4) таджы…кі;
5) Слаўгара…кі.

***6. Адзначце прыметнікі, у якіх трэба ўставіць спалучэнне КС:***
1) юна…кі;
2) Беласто…кі;
3) калмы…кі;
4) узбе…кі;
5) Рэйк'яві…кі.

***7. Адзначце прыметнікі, у якіх трэба ўставіць мяккі знак:***
1) Дарданел…скі;
2) жнівен…скі;
3) Цянь-шан…скі;
4) Свержан…скі;
5) Свіцяз…скі.

***8. Адзначце правільна напісаныя прыметнікі:***
1) венесуэльскі;
2) Кранштацкі;
3) Будапештскі;
4) казахскі;
5) казацкі.

***9. Адзначце няправільна напісаныя прыметнікі:***
1) студзенскі;
2) Астраханскі;
3) Цяньцзіньскі;
4) Гданьскі;
5) восенскі.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

***10. Адзначце правільна ўтвораныя і запісаныя прыметнікі:***
1) Маладзечанскі;
2) абедзены;
3) Асіповічскі;
4) Сцёпкін;
5) племянны.

## ПРАВАПІС СКЛАДАНЫХ ПРЫМЕТНІКАЎ. ПРАВАПІС СУФІКСАЎ ПРЫМЕТНІКАЎ

### Варыянт 2

***1. Адзначце прыметнікі, якія пішуцца разам:***
1) мала/вядомы спосаб;
2) медна/рудны сплаў;
3) дваццаці/градусны мароз;
4) залаціста/шаўковыя валасы;
5) Паўднёва/Афрыканская рэспубліка.
***2. Адзначце прыметнікі, якія пішуцца праз злучок:***
1) глуха/нямы чалавек;
2) паўночна/заходні напрамак;
3) сардэчна/сасудзістыя захворванні;
4) горна/лыжны курорт;
5) агульна/народная задача.
***3. Адзначце правільна напісаныя прыметнікі:***
1) грамадска-карысны;
2) празрыста-халодны;
3) грамадска-палітычны;
4) паўночна-карэйскі;
5) паўднёва-ўсходні.
***4. Адзначце няправільна напісаныя прыметнікі:***
1) інфармацыйна-аналітычны;
2) жалеза-бетонны;
3) далёкаўсходні;
4) вясенне-летні;
5) паўтара-кіламетровы.
***5. Адзначце прыметнікі, у якіх трэба ўставіць літару С:***
1) палес…кі;
2) тавары…кі;
3) паўстанц…кі;

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

4) дацэнц…кі;
5) курд…кі.

***6. Адзначце прыметнікі, у якіх трэба ўставіць спалучэнне КС:***

1) домаўладальні…скі;
2) Казбе…скі;
3) бас…кі;
4) меншаві…кі;
5) Слуц…кі.

***7. Адзначце прыметнікі, у якіх трэба ўставіць мяккі знак:***

1) Тайван…скі;
2) жнівен…скі;
3) Хатын…скі;
4) восен…скі;
5) Венесуэл…скі.

***8. Адзначце правільна напісаныя прыметнікі:***

1) клятвенны;
2) сцюдзённы;
3) палымянны;
4) цемянны;
5) лімонны.

***9. Адзначце няправільна напісаныя прыметнікі:***

1) паўдзённы;
2) бетонны;
3) арлінны;
4) страмянны;
5) свінны.

***10. Адзначце правільна ўтвораныя і запісаныя прыметнікі:***

1) Верачкін;
2) нацысцкі;
3) славацкі;
4) гродненскі;
5) Тбілісскі.

## ЛІЧЭБНІК: РАЗРАДЫ ЛІЧЭБНІКАЎ

### Варыянт 1

***1. Адзначце лічэбнікі:***

1) сямёрка;
2) першы;

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

3) апошні;
4) паўтара;
5) кожны.

***2. Адзначце колькасныя лічэбнікі:***

1) тры сотыя;
2) мільярдны;
3) адна;
4) усякі;
5) абое.

***3. Адзначце парадкавыя лічэбнікі:***

1) чацвёрты;
2) шасцітомны;
3) трэці;
4) трайны;
5) пяцітысячны.

***4. Адзначце простыя лічэбнікі:***

1) абодва;
2) статысячны;
3) дзевяноста;
4) паўтары;
5) дванаццаць.

***5. Адзначце складаныя лічэбнікі:***

1) старублёвы;
2) сямнаццаць;
3) пяцьдзясят першы;
4) семсот;
5) васьмісотмільённы.

***6. Адзначце сказы, у якіх лічэбнік выконвае сінтаксічную функцыю дзейніка (уваходзіць у склад дзейніка):***

1) Янукевічу было гадоў пад пяцьдзясят (Т. Хадкевіч).
2) Дзве вясковыя дзяўчынкі збіралі ягады ў лесе (Я. Маўр).
3) Абодвум хлопчыкам не хацелася выходзіць з пакоя.
4) Да паступлення засталося паўтара года.
5) На стале ляжала падшыўка з трыццаці дзвюх газет.

***7. Адзначце сказы, у якіх лічэбнік выконвае сінтаксічную функцыю выказніка (уваходзіць у склад выказніка):***

1) Наша вёска – за шэсць кіламетраў ад горада.
2) У адказе было запісана шэсць дзясятых.
3) Рост у хлопца – сто восемдзесят сантыметраў.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

4) Пеця стартаваў першым.

5) Да помніка яшчэ кіламетра з паўтара.

***8. Адзначце сказ(ы), у якім (якіх) лічэбнік выконвае сінтаксічную функцыю дапаўнення:***

1) Усяго за час вайны на Беларусі разам з жыхарамі знішчана шэсцьсот дваццаць сем вёсак ("Маладосць").

2) На Беларусі расце больш за сорак дубоў-волатаў ("Родная прырода").

3) Пяцярым шчанятам у будцы не сядзелася.

4) Пасёлак амаль не падаваў прыкмет жыцця, толькі над трыма высокімі комінамі віўся слабы дымок (М. Южык).

5) На выгляд яму было гадоў трыццаць.

***9. Адзначце сказы, у якіх лічэбнік выконвае сінтаксічную функцыю азначэння:***

1) У вёсцы Кажан-Гарадок Лунінецкага раёна расце дуб вышынёю больш за трыццаць пяць метраў ("Родная прырода").

2) Шклянка была прыблізна дзвесце грамаў.

3) Абедзвюм сёстрам прапанавалі вучыцца далей.

4) Лічэбнік *абое* выкарыстоўваецца, калі гаворка ідзе пра асоб рознага полу.

5) Ураджай сёлета ў паўтара раза большы, чым летась.

***10. Адзначце сказы, у якіх лічэбнік выконвае сінтаксічную функцыю акалічнасці:***

1) Дуб пражыў у лесе гадоў трыста, не меней (І. Чыгрынаў).

2) Дваццаць другога сакавіка тысяча дзевяцьсот сорак трэцяга года карным батальёнам нямецка-фашысцкіх войск спалена разам з жыхарамі вёска Хатынь ("Маладосць").

3) Алена была найлепшай вучаніцай у сваім дзясятым класе.

4) Нас было пяцёра.

5) Чамадан такі цяжкі, што і абедзвюма рукамі не падняць.

## ЛІЧЭБНІК: РАЗРАДЫ ЛІЧЭБНІКАЎ

### Варыянт 2

***1. Адзначце лічэбнікі:***

1) паўтары;

2) дзве пятыя;

3) учатырох;



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

4) сямёра;

5) дзясятка.

***2. Адзначце колькасныя лічэбнікі:***

1) адны;

2) васямнаццаты;

3) сотня;

4) двойка;

5) дзясяцера.

***3. Адзначце парадкавыя лічэбнікі:***

1) двайны;

2) двухмільённы;

3) трыццаты;

4) восьмы;

5) патроены.

***4. Адзначце простыя лічэбнікі:***

1) паўтара;

2) шасцёра;

3) абедзве;

4) трыццаць;

5) сто сорак.

***5. Адзначце састаўныя лічэбнікі:***

1) стапяцідзесяцітысячны;

2) трыста другі;

3) сорак чатыры;

4) паўтараста;

5) сямітонны.

***6. Адзначце сказы, у якіх лічэбнік выконвае сінтаксічную функцыю дзейніка (уваходзіць у склад дзейніка):***

1) Гэтаму дубу больш за сто пяцьдзясят гадоў.

2) Тры пятыя соткі агарода былі засаджаны памідорамі.

3) Каля дзвюх гадзін давялося чакаць цягніка на Гомель.

4) Пяць чалавек сядзела ля агню.

5) Дзед ніяк не адважваўся расстацца з пяццюстамі тысячамі рублёў.

***7. Адзначце сказы, у якіх лічэбнік выконвае сінтаксічную функцыю выказніка (уваходзіць у склад выказніка):***

1) Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны ў Мінску налічвалася чатырыста семдзесят вуліц (У. Караткевіч).

2) Я пайшоў на Ткачовае балота, якое кіламетры за чатыры (А. Федарэнка).



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

3) Агульная тэрыторыя Рэспублікі Беларусь складае дзвесце сем цэлых шэсць дзясятых тысяч квадратных метраў ("Звязда").

4) Марына прачытала тры кнігі.

5) Плошча запаведніка – восемдзесят гектараў.

***8. Адзначце сказы, у якіх лічэбнік выконвае сінтаксічную функцыю дапаўнення:***

1) Маці ганарылася абодвума сынамі.

2) Тры дні ідзе праліўны дождж.

3) Міхаська прынёс тры яблыкі.

4) Падводы ехалі па абодвух берагах ракі.

5) Школа ганарылася дваццаццю адным пераможцам спартыўных спаборніцтваў.

***9. Адзначце сказы, у якіх лічэбнік выконвае сінтаксічную функцыю азначэння:***

1) У шасцідзясятую кватэру ўехалі новыя жыхары.

2) У парку саўгаса "Сітцы" Докшыцкага раёна красуецца дуб вышынёю ў дваццаць шэсць метраў ("Родная прырода").

3) Алёша прыбег да фінішу трэцім.

4) Успамінаюцца падзеі тысяча дзевяцьсот дзевяноста пятага года.

5) Тэмпература паднялася да дваццаці градусаў.

***10. Адзначце сказы, у якіх лічэбнік выконвае сінтаксічную функцыю акалічнасці:***

1) Госці правялі ў Мінску два дні.

2) У Белавежскай пушчы дрэва-хмызняковай расліннасці каля дзевяцісот відаў.

3) Больш за паўтара месяца не было навін з фронту.

4) Да дзвюх алешын прыбіта доўгая жардзіна.

5) Выкладчык праэкзаменаваў сорак восем студэнтаў.

## УЖЫВАННЕ ЛІЧЭБНІКАЎ З НАЗОЎНІКАМІ

### Варыянт 1

***1. Адзначце правільна пабудаваныя спалучэнні лічэбнікаў з назоўнікамі:***

1) паміж двума бярозкамі;

2) абаімі хлопчыкамі;

3) двое зубранят;



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

4) паўтара літра;

5) сем дзясятых метра.

***2. Адзначце правільна пабудаваныя спалучэнні лічэбнікаў з назоўнікамі:***

1) дзявяцера аднакласнікаў;

2) чатыры знаёмых;

3) дзве цэлыя пяць дзясятых цэнтнераў;

4) абое, брат і сятра;

5) абодва вядры.

***3. Адзначце няправільна пабудаваныя спалучэнні лічэбнікаў з назоўнікамі:***

1) дваццаць чацвёра сутак;

2) тры пятых ураджаю;

3) трое генералаў;

4) абодва акны;

5) чатыры качаняты.

***4. Адзначце няправільна пабудаваныя спалучэнні лічэбнікаў з назоўнікамі:***

1) тры пятых насельніцтва;

2) двое дубоў;

3) сорак чацвёра нажніц;

4) паўтара рубля;

5) абедзве дзяўчынкі.

***5. Адзначце сказы з правільна ўжытымі і запісанымі лічэбнікамі:***

1) Ніна з Пецем стаялі і абодва маўчалі.

2) Хлопцы чакалі адно аднаго.

3) Дзяўчаты – іх было трое – чакалі ў прыёмнай.

4) Прайшло дваццаць чацвёра сутак.

5) Кіламетра за паўтара ад вёскі рос невялічкі бярэзнік.

***6. Адзначце назоўнікі, якія могуць ужывацца з лічэбнікам абодва:***

1) акцёр;

2) гадзіннік;

3) акуляры;

4) кацяня:

5) жырафа.

***7. Адзначце назоўнікі, якія могуць ужывацца з лічэбнікам чацвёра:***

1) гуслі;

2) тэлефон;

3) плыўчыха;



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

4) жарабя;

5) магіляўчанін.

***8. Адзначце словазлучэнні, у якіх лічэбнікі звязаны з назоўнікамі сувяззю дапасавання:***

1) сямі сшыткаў;

2) дванаццаць таполяў;

3) трохсот карцін;

4) абодва лётчыкі;

5) пяцёра нажніц.

***9. Адзначце словазлучэнні, у якіх лічэбнікі звязаны з назоўнікамі сувяззю кіравання:***

1) абедзве старонкі;

2) сямітысячны жыхар;

3) тры зубры;

4) сто сорак валуноў;

5) дзявяцера аднакурснікаў.

***10. Адзначце словазлучэнні, правільна перакладзеныя на беларускую мову:***

1) в трех шагах – *за тры крокі*;

2) более полутора страниц – *больш за паўтары старонкі*;

